Плюс: Беларусь. Технология ПРОФ [Электронный ресурс] / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2014.
3. *Доўнар, Т.І.* Развіццё асноўных інстытутаў грамадзянскага і крымінальнага права Беларусі ў XV – XVI стагоддзях / Т.І. Доўнар. – Мінск: Пропилеи, 2000. – 224 с.
4. Статут Великого Княжества Литовского 1529 года. – Минск: Издательство Академии наук БССР, 1960. – 254 с.
5. Статут Вялікага княства Літоўскага 1566 года / Т.І. Доўнар, У.М. Сатолін, Я.А. Юхо; рэдкал. Т.І. Доўнар [і інш.]. – Мінск: Тэсей, 2003. – 352 с.
6. Статут Вялікага княства Літоўскага 1588: Тэксты. Давед. Камент. / Беларус. Сав. Энцыкл.; Рэдкал.: І.П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелСЭ, 1989. – 573 с.
7. Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 года: юбілейнае выданне / С.А. Балашэнка, Т.І. Доўнар, Л.Л. Голубева. – Мінск: Прынткорп, 2010 . – 614 с.
8. *Юхо, И.А.* Правовое положение населения Белоруссии в XVI веке / И.А. Юхо. – Минск: Изд-во БГУ им. В.И. Ленина, 1978. – 144с.

## БНР–ЛІТБЕЛССР–БССР: РОЗДУМ АБ ПАКУТНЫМ ШЛЯХУ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

**Т. Н. Казак**

Працэс станаўлення беларускай дзяржаўнасці быў надзвычай цяжкім, складаным і драматычным. Значнымі падзеямі ў гэтым працэсе з`явіліся абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі і Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі: дзвюх рэспублік з кардынальна рознымі і адметнымі сацыяльна-палітычнымі сістэмамі, якія былі створаны з мэтай дасягнення самавызначэння беларускага народа і ўтварэння нацыянальнай дзяржавы.

Галоўнымі перадумовамі стварэння беларускай дзяржаўнасці з`яўляюцца:

- уздым нацыянальна-вызваленчага руху;
- перамога савецкай улады ў Беларусі.

Беларускі нацыянальна-вызваленчы рух быў слабы і меў малую папулярнасць, бо трымаўся на інтэлігенцыі, якая выйшла, у асноўным, з асяродка апалячанай шляхты, не мела навыкаў кіравання дзяржавай і намагалася, у першую чаргу, да нацыянальнага вызвалення, а не да сацыяльных пераўтварэнняў. Прыхільнікі беларускага нацыянальна-вызваленчага руху ўсімі сіламі адстойвалі БНР як еўрапейскую буржуазна-дэмакратычную дзяржаву. Але іх намаганні змяніць ход падзей і пад лозунгам “нацыянальнага самавызначэння” адарваць Беларусь ад рэвалюцыйнай Расіі праваліліся. Нацыяналістычная “рэвалюцыя” пацярпела паражэнне.

Беларуская Народная Рэспубліка – першая гістарычная форма беларускай дзяржаўнасці XX ст. Утварэнне БНР адбывалася без удзелу народных мас, з апорай на іншаземных інтэрвентаў. У прамым сэнсе яна

дзяржавай не была, бо не мела сапраўднай сістэмы органаў улады, уласных узброеных сіл, мясцовых органаў улады, фінансавай і судовай сістэмы. Устаўныя граматы БНР вызначылі асноўныя палажэнні аб грамадскім і дзяржаўным ладзе Беларусі. БНР – спроба стварэння беларускай дзяржаўнасці, якая паскорыла падрыхтоўку датэрміновага ўтварэння Берарускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі і стала яе аўтэнтычнай, тэрытарыяльнай, эканамічнай, этнічнай базай.

Дыпламатычная дзейнасць прадстаўнікоў БНР мела значныя вынікі. У 1918–1920 гг. БНР de jure прызналі Украіна, Фінляндыя, Латвія, Літва, Эстонія, Чэхаславакія, de facto – Балгарыя, Германія, Турцыя. Гэта, безумоўна, можна лічыць перамогай дыпламатаў БНР, іх намаганні не былі марнымі. Яны стварылі трывалы падмурак для далейшага развіцця беларускай дзяржаўнасці.

Гісторыя стварэння БССР – сведка цяжкасці працэсу нацыянальнага самавызначэння Беларусі. БССР з'явілася вынікам палітычнай гульні бальшавіцкіх кіраўнікоў Расіі і Заходняй вобласці, прадыктаваным, у асноўным, знешнепалітычнымі абставінамі і спробамі супрацьпастаўлення сацыялістычнай і буржуазнай рэспублікі.

Абвяшчэнне БССР 1 студзеня 1919 г. – адзін з вынікаў нацыянальна-гістарычнага будаўніцтва, пачатага ў савецкай краіне з перамогай Кастрычніка. Абвяшчэнне БССР азначала перамогу ідэі беларускай савецкай дзяржаўнасці.

Пралетарскі інтэрнацыяналізм як ідэалогія і практыка савецкай улады атрымаў у Беларусі поўную перамогу над нацыяналізмам.

Незалежнасць новаўтворанай дзяржавы аказалася фармальнай. БССР праз месяц пасля абвяшчэння незалежнасці і ўтварэння сваёй дзяржаўнасці стала часткай аб`яднанай дзяржавы – ЛітБелССР. Галоўнай знешнепабуджальнай прычынай зліцця рэспублік з`явілася аб`яднанне ў мэтах узмацнення іх абараназдольнасці. Галоўнай мэтай – арганізацыя барацьбы з Беларускай Народнай Рэспублікай і абвешчанай Літоўскай буржуазнай дзяржавай і, такім чынам, выкананне функцый буфернай дзяржавы.

31 ліпеня 1920 г. была прынята “Дэкларацыя аб незалежнасці Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусі”. Дэкларацыя аб`яўляла аб стварэнні Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі, абвешчанай Маніфестам 1 студзеня 1919 г., пацвярджала сацыялістычныя асновы грамадскага і дзяржаўнага ладу Савецкай Беларусі і падкрэсліла, што БССР будуецца на прынцыпах дыктатуры пралетарыяту і выкарыстання вопыту Савецкай Расіі.

Аднаўленне БССР стала магчымым толькі пасля атрымання беларускімі камуністамі адпаведнага дазволу Масквы. Пад час рыжскіх

перамоў лёс Беларусі вырашаўся Масквой і Варшавай без удзелу прадстаўнікоў БССР. Воля і інтарэсы беларускага народа ігнараваліся, прыносіліся ў ахвяру інтарэсам сусветнай рэвалюцыі.

Безумоўна, пры аналізе падзей першага і другога абвяшчэння Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі трэба рабіць зніжку на асаблівасці часу, на вострую патрэбу краіны ў палітычнай сіле, здольнай узяць ініцыятыву ў свае рукі, пайсці на непапулярныя рашэнні і, пры неабходнасці, узяць на сябе адказнасць.

Стварэнне беларускай дзяржаўнасці ў 1917–1920 гг. паўплывала на далейшае развіццё гісторыі дзяржавы і права Беларусі. Бясцэнны вопыт аб`яднання беларускага народа ў рамках адной краіны ў той час дапамог і дапамагае нам сёння ўпэўнена прагназаваць і ў патрэбным накірунку ўздзейнічаць на далейшае развіццё нацыянальнай дзяржаўнасці, правільна ацэньваць значэнне нацыянальных асаблівасцяў у грамадскім развіцці і будаваць нашу дзяржаву – Рэспубліку Беларусь.

## ОСОБЕННОСТИ МОДЕЛИРОВАНИЯ ВЗЯТОЧНИЧЕСТВА НА ОСНОВЕ МАТЕРИАЛЬНОЙ СТРУКТУРЫ ПРЕСТУПЛЕНИЯ

**К. В. Каченя**

В основу современной методики расследования преступления положены два учения: о криминалистической характеристике и о материальной структуре преступления (далее – МСП). На сегодняшний день предпочтительное применение МСП связывают с тем, что оно наиболее полно раскрывает сущность расследуемого преступления.

**МСП** − система внутренних связей, объединяющая входящие в нее материальные элементы, которые представляют собой необходимую и достаточную совокупность объектов, в своем взаимодействии обеспечивающую наступление преступного результата [1, с. 51].